Феерично продолжила фестиваль концертная программа гродненского музыкального театра «Рада», с творчеством которого зельвенцы уже знакомы. Артисты поздравляли горожан с 80-летием района. Получается: уже по традиции коллектив заряжал зрителей своей неиссякаемой энергией и харизмой. Казацкая, белорусская и цыганские темы, презентованные ими, в буквальном смысле завораживали. Лезгинка с саблями, энергичный гопак, цыганские мотивы… – от драйва и энергии, исходящих от «Рады», гостям сложно было усидеть на месте. И отдельные из них даже пустились в пляс!

Не меньший ажиотаж вызвала и вечерняя программа, символично закрывшая юбилейную ярмарку. Финальная точка кирмаша была динамичной, громкой, огненной (в буквальном смысле слова) и даже романтичной. Влюблённый зельвенец по-настоящему удивил и, вероятнее всего, восхитил многих зрителей, сделав громкое мужское предложение с главной сцены фестиваля, – любить и быть преданным своей половинке на протяжении всей жизни. Девушка ответила долгожданное «Согласна!». Но вернёмся к запланированным событиям вечернего концерта. Горожан порадовали поющие красавицы из группы «ByCiti», удивлявшие не только эффектными внешними данными, но и оригинальным исполнением всеми любимых хитов.

Ярко и динамично ворвались на главную сцену танцовщицы с точёными фигурками из брестского театра танца «Фантазия». Костюмы и хореография прелестниц уж точно покорили множество мужских сердец.

А вот исполнители-мужчины брали харизмой, мужественностью и силой голоса. Арт-группа «Беларусы» сорвала бурные овации. Вслед за ними – минские барабанщики, «огненные» артисты и столичный кавер-бэнд «Coza Nostra». И, конечно, впечатляющий подарок в честь 300-летней ярмарки (такой же яркий, как и вся трёхдневная программа фестиваля) – завораживающий прощальный салют! Бывай, кирмаш!

**Шматко, Я. Не забыў кірмаш і пра Слова: зэльвенскія паэты парадавалі чытачоў новымі творамі [Электронный ресурс]. – Режим доступа:** https://zelwa.by/ne-zabyu-kirmash-i-pra-slova/ **. – Дата доступа: 24.08.2021.**

**Шматко, Я. Не забыў кірмаш і пра Слова / Яніна Шматко // Праца. – 2021. – 24 августа. – С. 6.**

Бібліятэкары Зэльвенскай бібліятэкі скарысталіся прыездам на Ганненскі кірмаш землякоў-паэтаў і папрасілі парадаваць чытачоў новымі творамі.

Ва ўтульнай зале бібліятэкі сабраліся творцы Уладзімір Мазго, Валянцін Семяняка, Ірына Войтка і Алена Кароза. Іх ужо чакалі тыя, хто без шкадавання пакінуў забавы каля млына, на плошчы ды на вуліцах пасёлка, каб у чарговы раз наталіцца Словам.

Вядучыя Вольга Камякевіч і Алена Жукоўская нагадалі пра творчыя здабыткі нашых землякоў і папрасілі падрабязней расказаць пра сябе, пра здзейсненае і задумы на будучае.

Уладзімір Мазго – часты госць у бібліятэцы і школах раёна. На Зэльвенскія сакавіны да пандэміі ён прывозіў шмат сваіх сяброў: пісьменнікаў, кампазітараў, спевакоў. “Спадзяюся, – сказаў Уладзімір Мінавіч, – што на наступны год мы зможам узнавіць сустрэчы, і Зэльву наведае яшчэ шмат новых творцаў. Гэта і для мяне вельмі важна. Пасля паездак у Зэльву мне добра пішацца: малая радзіма натхняе на новыя вершы для дзяцей і дарослых. Пішу і пра сам пасёлак, дзе нарадзіўся, і пра Бярэжкі, дзе жыў з бацькамі ў дзяцінстве і юнацтве, і пра іншыя вёскі, дзе давялося бываць, пра вадасховішча, пра дарагіх майму сэрцу людзей”.

Мы ўжо знаёмілі чытачоў “Працы” з апошнімі кнігамі Мазго: “Знічкі вечнасці” і “Хутка стану чэмпіёнам”. Вершы з іх і гучалі на сустрэчы, а самі зборнікі былі падараваны бібліятэцы. А яшчэ пра адну навінку выдавецтва “Беларуская Энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі” распавёў Уладзімір Мінавіч – кнігу для настаўнікаў і вучняў пачатковых класаў “Сустрэча з пісьменнікам”. Тут змешчаны біяграфіі і творы дзяцячых пісьменнікаў Беларусі. Сярод іх, вядома, імя Мазго і, што вельмі для нас цікава, некалькі тых, хто быў госцем Зэльвенскіх сакавін. Гэта Генадзь Аўласенка, Анатоль Зэкаў, Мікола Маляўка, Міхась Пазнякоў, Мікола Чарняўскі і Уладзімір Ягоўдзік. Дапаможнік-хрэстаматыя, прыгожа аздоблены такімі знакамітымі мастакамі, як Павел Татарнікаў, Васіль Шаранговіч і іншымі, таксама ўпрыгожыць фонд бібліятэкі.

Валянцін Семяняка, хоць і стаў як парламентарый жыхаром сталіцы, па-ранейшаму лічыць сябе зэльвенцам. “Не разумею тых, хто адносіцца да родных вёсак як да “мядзвежага кутка”, – з горыччу сказаў ён. – Так, вёскі зараз малалюдныя, але з імі звязана столькі дарагіх успамінаў, што і ў думках не дазволіш зняважыць памяць пра іх. Для мяне Цяглевічы, дзе рос і мужнеў, – святое месца. Ды і іншыя вёскі, дзе працаваў і жыў, – таксама.

На пытанне, як прыходзіць натхненне і яго вынік – паэтычны радок, – Валянцін Міхайлавіч адказаў шчыра: “Гэтага нельга перадаць словамі. Напэўна, сам Усявышні водзіць тады тваёй рукой. І хоць я не лічу сябе

паэтам, а як казаў некалі Эльдар Разанаў, тым, хто “затесался среди поэтов”, стараюся, каб тое, што дае Бог, апрацаваць так, каб не было сорамна перад чытачамі”.

Валянцін Міхайлавіч вельмі ўдзячны Уладзіміру Мазго, які не дае яму спачыну як паэту, падштурхоўвае да творчасці. “Уладзімір Мінавіч і мой зборнік “Зорка залатая” рэдагаваў, і рэцэнзію на яго ў “ЛіМ” напісаў, і рэкамендацыю ў Саюз пісьменнікаў Беларусі даваў”, – нагадаў Семяняка прысутным. Прагучала некалькі твораў, у тым ліку верш-роздум аб пандэміі, што так змяніла наша жыццё.

Ураджэнкі Караліна Ірына Войтка і Алена Кароза – юбіляркі гэтага года, і бібліятэкары спадзяюцца, што абавязкова ўбачаць іх у сценах установы яшчэ раз восенню. Ірына Антонаўна – нястомны прагандыст роднага слова. “Я 19 гадоў узначальвала беларускамоўны дзіцячы сад у Слоніме, – распавяла яна.

– Дзеткі нашы вельмі любілі размаўляць на роднай мове, вучылі на памяць вершы беларускіх пісьменнікаў. Усе нашы мерапрыемствы мы праводзілі толькі па-беларуску, гульні былі толькі беларускія. Спадзяюся, што выгадавалі сапраўдных патрыётаў Радзімы”.

Да Дня беларускага пісьменства, які праходзіў у Слоніме ў 2019 годзе, літаратурнае аб’яднанне імя Анатоля Іверса, якім кіруе Ірына Войтка, падрыхтавала альманах “Старонка”. У яго ўвайшлі творы 17-ці аўтараў, у тым ліку і ўраджэнцаў Зэльвеншчыны: Івана Сяргейчыка, Надзеі Салейка і самой Ірыны Войтка. Ірына Антонаўны і склала зборнік, і прадмову да яго напісала. Некаторыя свае творы з альманаха прапанавала ўвазе слухачоў.

Алена Кароза згадала, як працавала над дыпломнай работай, прысвечанай гісторыі Зэльвы, калі заканчвала гістарычны факультэт БДУ. “Тады многія сумняваліся, ці змагу адолець гэтую тэму, бо вельмі мала што можна было знайсці ў друку пра нас: гэта быў канец 70-х гадоў мінулага стагоддзя. Працавала ў дзяржаўных архівах Гродна, Зэльвенскага райвыканкама, з матэрыяламі “Працы” за 1971 – 1978 гг. і г.д. І вельмі рада, што здзейснілася мая мара, што цеплілася тады ў душы, і што адрадзіўся і завіраваў у нас Ганненскі кірмаш”.

Дарэчы, яшчэ адна мара Алены Станіслаўны, выказаная ў прачытаным вершы “Млын”, чакае свайго здзяйснення: стварэнне ў будынку старога млына гісторыка-краязнаўчага музея.

Хочацца верыць, што так яно і будзе: нездарма з нагоды 300-годдзя Ганненскага кірмашу так шырока выкарыстоўвалася пляцоўка каля млына.

Знаёмім чытачоў “Працы” з некалькімі творамі згаданых паэтаў, што прагучалі на сустрэчы.

**Уладзімір Мазго**

***

У вочы нам глядзіць
Абсяг, абраны лёсам,
Дзе зоркі дагадзіць
Стараюцца нябёсам.
Дзе вечнасць на зямлю,
Як шчодры дождж, ліецца.
Зямлю, што я люблю
Здавён душой і сэрцам.
Дзе кожны новы дзень
Надзею набліжае,
Што болей нам нідзе
Ніхто не пагражае.
Радзімы берагі
Спрыяюць чалавеку,
Як прашчураў багі,
Шануем што спрадвеку.
А хмара набяжыць –
Ёй сонейка не ўкрасці,
Дзе мы з табою жыць
Нязменна лічым шчасцем.

**Валянцін Семяняка**

***МАЛІТВА***

Памолімся шчыра да моцных нябёсаў,
Памолімся шчыра да лікаў святых!
За ўсё, што збылося і што адбылося,

Падзякуем Богу, браты!
За хлеб наш надзённы і клопат шодзённы,
За веліч і бляск купалоў залатых,
За спелыя нівы і буйныя пожні
Падзякуем Богу, браты!
Каб зоры на небе і яснае сонца
Ніколі не згаслі пад цемрай слаты,
За нашых нябесных айцоў абаронцаў
Падзякуем Богу, браты!
Хай наша малітва над светам лунае!
Хай будзіць у сэрцах змярцвелых любоў!
За Божую ласку, што межаў не знае,
Памолімся дружна ізноў!

**Ірына Войтка**

***

Наваколле… наваколле…
Гэта Бог паслаў праз поле
пехам путніка прайсці.
Каб убачыў сябе годна
ён на тым палетку родным,
каб пачуўся чалавекам,
што прызначана адвеку.
Каб ступіў шырокім крокам
па раллі сваёй высокай.
Грудзі поўныя паветра
удыхнуў зялёных нетраў.
І расправіў свае плечы
для вятроў сустрэчных сечы. …

Хоць аднойчы ў наваколлі

перайдзі праз свае поле!

**Алена Кароза**

***ЦУДАТВОРНАЯ ВІЛЬГАЦЬ ЗЯМЛІ***

Не цурайцеся, людзі, сваёй мовы роднае,

Не адракайцеся вы ад яе.

На ёй на буслянцы наш бусел клякоча.

На ёй і салоўка у садзе пяе.

На ёй васілёчкі шапочуць у жыце,

І ў лузе над кветкай гудуць матылі.

Яна нашых сэрцаў і душаў пажытак,

Яна – цудатворная вільгаць зямлі.

На ёй каласочак жытнёвы гаворыць,

Як кліча аратага жніва пачаць.

На ёй першакласнік склаў першае слова,

Калі пачынаў ён буквар свой чытаць.

Яна ад калыскі да ўздыху апошняга

На вуснах, у думках, ў кнігарні, ў душы.

Яна мілагучная і непаўторная

І лепшай няма, што мне ні кажы.

**Зэльва адсвяткавала Ганненскі кірмаш. Рэпартаж з месца падзей (відэа) [Электронный ресурс]. – Режим доступа:** https://zelwa.by/annenskij-kirmash-reportazh-s-mesta-sobytij/ **. – Дата доступа: 24.08.2021.**

Тры дні фестывалю праляцелі як адно імгненне. Але запомніліся яркімі падзеямі і насычанымі мерапрыемствамі. Як зельвенцы адсвяткавалі 300-гадовы Ганненскі кірмаш, глядзіце ў нашым відэарэпартажы.

**«Анненский кирмаш – это новые знакомства, невероятные впечатления и осознанное желание вернуться на фестиваль вновь». Жители и гости поселка делятся впечатлениями о празднике (опрос) [Электронный ресурс]. – Режим доступа:** https://zelwa.by/annenskij-kirmash-eto-novye-znakomstva-neveroyatnye-vpechatleniya-i-osoznannoe-zhelanie-vernutsya-na-festival-vnov-zhiteli-i-gosti-poselka-delyatsya-vpechatleniyami-o-prazdnike-opros/ **. – Дата доступа: 25.08.2021.**

**Праздник – глазами участников // Праца. – 2021. – 28 августа. – С. 9.**

Анненский кирмаш прошел, а впечатления о торжестве остались. И ими с корреспондентами газеты «Праца» с радостью поделились участники гуляний – жители и гости поселка.

**Виктория Ванович, Зельва:**

*– Я ценю то, что сидя в декрете, могу никуда не ехать – просто выйти у себя в Зельве и прекрасно провести время вместе с ребенком. А одно из мероприятий для семейного досуга, – конечно же, Анненский кирмаш. Очень рада, что он с каждым годом становится все интереснее и краше. Естественно мне понравилось многое, но запал в душу – и есть за что – заплыв на чем попало, тем более что я болела за Пропанчика (участника от РГЭС). Уверена, не одну меня воодушевил долгожданный концерт нашей землячки Вероники Столпец. Второй же день провели традиционно – побродили у палаток ремесленников и прикупили сувениры на память. Прекрасно, что добавились новые площадки, интересные, разнообразные, достойные.*

**Кристина Солодухо, Слоним:**

*– Что для меня юбилейный Анненский кирмаш? Новые знакомства, невероятные впечатления и осознанное желание вернуться на ваш фестиваль вновь.*

*Это уже далеко не первый мой визит в Зельву: работала здесь, приезжаю к подруге. В обычное время горпосёлок – тихое комфортное для жизни место, где всё идёт своим чередом, но во время кирмаша картина кардинально меняется. Признаюсь: я не ожидала увидеть такое количество отдыхающих! Сколько было гостей? Не меньше пяти тысяч?! Но настоящим сюрпризом для меня стала встреча со знаменитым белорусским спортсменом, олимпийцем, гордостью слонимчан Иваном Тихоном. Конечно, я не упустила возможности сделать с ним фото. Кстати, подобных памятных снимков у меня осталось немало.*

*Как фотографу, мне хотелось запечатлеть каждый момент праздника: настолько яркие и колоритные были локации. Десятки ремесленников с аутентичной продукцией, рыцари, артисты на ходулях, костюмированное шествие… – просто глаза разбегались. Ещё парочка визитов на Анненский кирмаш – и можно задумываться о фотовыставке.*

**Дмитрий Андреев, Минск:**

*– В Зельве я впервые, хоть в принципе объехал практически всю Беларусь: бывал и в больших, и в маленьких городах, многих деревнях. Перед поездкой решил немного, так сказать, познакомиться с местностью – спросил о районе у Google. Узнал, что, несмотря на небольшую численность населения, у зельвенского края есть свой флаг, герб, богатая история и 300-летний брендовый праздник – Анненский кирмаш. Признаюсь, был впечатлен полученной информацией. А еще больше удивился увиденному по приезду. Привлекла внимание инфроструктура: красивый парк и сквер, памятник воинам Великой Отечественной войны, скульптура лошади, старинная мельница. У вас чисто, аккуратно и уютно и это классно. А какой крутой праздник получился! Буду рассказывать еще долго о нем столичным друзьям и знакомым. В следующем году соберу большую компанию и с большим удовольствием приеду на ярмарку вновь.*

**Светлана Дубчонак, Кореличи:**

*– Первый раз в жизни я, имеющая художественное образование, приняла непосредственное участие в пленэре мастеров по соломоплетению. У вас на зельвенской земле также познакомилась со многими ремесленниками – и это огромный плюс, в чем не сомневаюсь нисколько! В дальнейшей работе со школьниками передам им новые идеи, интересные методики работы с соломкой и другими материалами, с помощью которых создаются истинные шедевры декоративно-прикладного творчества.*

*А поучиться на ярмарке мне было у кого, уж поверьте! Многое, в том числе и для себя, переняла относительно украшения интерьера. К тому же все эти изюминки – точно знаю – будут востребованы моими ученицами: они практически постоянно готовят подарки родным и любят их удивлять. Спасибо за гостеприимство!*

**Наталья Шевчик, Мосты:**

*– Несмотря на то, что живём рядом, в Мостах, впервые с семьёй побывали в Зельве на «Анненском кирмаше».*

*Очень впечатлила площадка «Легендарные эпохи». Здесь было что посмотреть и чему удивиться.*

*Мужа, к примеру, больше интересовали турнирные поединки и показательные выступления участников исторической реконструкции, их костюмы, доспехи, оружие. А сын смог самостоятельно выковать монету, пострелять из арбалета и даже добыть огонь, как это делали наши далёкие предки. Очень удивило, насколько люди увлечены этой темой, историческим прошлым. Это вызывает уважение.*

*В «Городе мастеров» мы приобрели сувениры на память о празднике, а в зоне фудкорта — вкусно покушали. Очень понравился армянский шашлык.*

*В общем, покидали мы Зельву с желанием вернуться сюда ещё раз, на следующий кирмаш.*

**Олеся Плащинская, Минск:**

*– Приезжала на праздник с детьми, также в нашей компании была моя мама и сестра. Гуляли все 3 дня.*

*В первый – очень понравился «Заплыв на чем попало», особенно моим ребятам. А вот работа диджея на дискотеке разочаровала.*

*Во второй день впечатлило количество детских аттракционов, не хватило разнообразия животных (увидели только лошадей), можно было на будущее организовать что-то похожее контактному зоопарку.*

*Очень понравилось театрализованное открытие кирмаша. Зажигательным был вечерний концерт, а захватывающим фаер-шоу. Заворожил оригинальными номерами и эффектными нарядами коллектив танцевальной студии из Бреста.*

*В центре только не доставало большего количества посадочных мест и экрана, на подобии такого, как был в субботу на площадке у мельницы. Ведь людей было очень много и детям не всегда удавалось посмотреть на то, что происходило на сцене.*

*На третий день фестиваля на «Легендарные эпохи» мы последовали в том же составе. Организаторы этого шоу, конечно, большие молодцы! Хотелось бы отметить костюмы воинов, такие уже красивые и интересные. Приятно было, что со всеми участниками можно было сфотографироваться, никто не отказывал.*

*Вот только развлечений для детей здесь не наблюдали. Хотелось бы видеть, к примеру, лабиринт, чтобы спокойно опробовать «Эль», пострелять из лука или арбалета, ну или просто, не дергаясь, посмотреть на сражения.*

*Но в целом все было очень интересно, познавательно и развлекательно!*

**Людмила Гонакова, Гродно:**

*– От своей семьи хочу оставить отзыв об Анненском кирмаше в Зельве. Это было бомбически.*

*В первую очередь благодарю родственников, которые пригласили нас в гости. Попав на кирмаш в Зельве, мы прочувствовали незабываемую атмосферу творчества и невероятного драйва. Мы часто выезжаем за пределы родного региона, но такого давно не видели. Хочется отметить уровень организации, который для нас был впечатляющим.*

*Площадки и развлечения для детей, конные катания и шедевры местной кулинарии. Центр был украшен подворьями, где приглашали на различные мини-эстафеты.*

*Восторг от выступлений исторических клубов, представляющих разные эпохи. Их костюмы и лагеря, разбитые на поле возле мельницы, поразили своим правдоподобием, все было предусмотрено до мелочей. Благодаря ведущему мы гуляли по истории, вдыхали её аромат. Дети могли получить опыт в стрельбе из лука, арбалета и ружья.*

*Концерты были у водохранилища, в центре города и в поле у мельницы. Каждый мог насладиться музыкой, близкой по духу. Погода была замечательной, настроение – шикарным. Удивили ребята из Витебска, которые готовили очень вкусные чипсы из картофеля на шпажках. Впервые дети увидели процесс приготовления оригинального и любимого ими картофельного лакомства.*

*Завершилось все торжественным салютом.*

*Эти 3 волшебных дня в Зельве навсегда останутся в наших сердцах.*

**Шматко, Я. Важкі падмурак у будучую манаграфію пра Зэльву і Ганненскі кірмаш / Яніна Шматко // Праца. – 2021. – 28 августа. – С. 8-9.**

Як у папярэднія гады  навукоўцы Мінска і Гродна селета не абмінулі  Зэльву падчас Ганенскага кірмашу: у раённай бібліятэцы адбыўся круглы стол  на тэму “Ганенскі кірмаш. 300 гадоў”. Прапануем справаздачу з гэтай вельмі насычанай сустрэчы, у якой прынялі ўдзел кандыдаты гістарычных навук інстытута гісторыі  НАН Беларусі А.Б. Доўнар, Т.У. Варон, Т.Б. Даўгач, Р.У. Зянюк, дацэнт Дзяржаўнага  ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук М.М. Шаўчэня. Гасцей віталі гаспадары раёна Д.А. Альшэўскі, С.М. Лойка, парламентарыі В. М. Семяняка і В.А Ліскові. Прадставіла ўсіх дырэктар бібліятэкі С.А. Жамойціна.

**Даследчыкі ўнікальнай з'явы**

Кандыдат гістарычных навук М.М.Шаўчэня, намеснік дырэктара па вучэбна-вытворчай рабоце Гродзенскага палітэхнічнага каледжа, засяродзіў увагу на працах даследчыкаў унікальнай з'явы ў жыцці нашага мястэчка. На сённяшні час першым яго даследчыкам лічыцца Г. Астраменскі, які ў часопісе Міністэрства ўнутраных спраў за 1831 год змясціў артыкул "Описание Зельвенской ярмарки". Да гэтага Астраменскі ўжо меў нямала матэрыялаў аб беларускіх кірмашах першай паловы XIX стагоддзя, і яму было з чым параўнаць размах Зэльвенскага. Да асаблівасцей нашага кірмашу ён адносіў павелічэнне долі мясцовых вырабаў у агульным тавараабароце, добра падрыхтаваныя месцы для купцоў і спажыўцоў, маштабны гандаль коньмі. Прычым заўважае, што коней спецыяльна гадуюць цэлы год для продажу на дадзеным рынку. Кірмаш моцна ажыўляе мясцовую прамысловасць, ваколіцы Зэльвы нагадваюць шматлюдную вобласць, бо возчыкі, развозячы тавар, увесь месяц не выпрагаюць коней.

Да гэтага часу нельга з упэўненасцю назваць імя аўтара брашуры "Зэльвенскі кірмаш", апублікаванай ананімна ў 1840-я гады. З лёгкай рукі гісторыка І.Казлоўскага, які ў часопісе "Нёман" у 1968 годзе змясціў свой погляд на "Зэльвенскі кірмаш", напісаць брашуру мог Юзаф Крашэўскі. Гады жыцця віднага вучонага і краязнаўцы з-пад Пружан (1812-1887 гг.) дазваляюць лічыць слушным такое дапушчэнне. Тым болей, што яго вядомыя гістарычныя працы ("Успаміны Палесся, Валыні і Літвы", 1840 г., "Малюнкі з жыцця і падарожжаў", 1892 г. і інш.) падказваюць накірунак яго зацікаўленняў.

Дык вось, калі прыняць усё сказанае пад увагу, можна менавіта Крашэўскага лічыць аўтарам крылатых слоў аб Ганненскім кірмашы: "Ад вельмі даўніх часоў Зэльва і яе жыхары падначальваюцца здзіўляючаму праву, калі адзінаццаць месяцаў у годзе марнеюць, а толькі месяц жывуць". А тады дапоўнім выказванне вучонага яшчэ адным не менш цікавым назіраннем: першымі прывозілі свой тавар маскоўскія купцы. Менавіта яны "закладвалі краевугольны камень кірмашу і так дакладна прытрымліваліся даты свайго прыбыцця ў Зэльву, як жаваронак вясны". Цікава і прыгожа. Ці не так?!

Расказаў Міхаіл Шаўчэня і пра палеміку наконт Зэльвенскага кірмашу паміж Паўлам Баброўскім і Уладзімірам Шыраевым, якую яны вялі на старонках "Віленскага весніка". Баброўскі лічыў, што не зручнае становішча Зэльвы стала прычынай росквіту ў ёй кірмашу, а штучныя меры, якія прымалі для гэтага яе гаспадары. І чыгунка, якая пройдзе праз Зэльву, не будзе на карысць гандлю ў ёй. Шыраеў, наадварот, лічыў, што адмоўнага ўплыву на кірмаш чыгунка не прынясе, бо бяднейшая частка гандляроў і пакупнікоў застануцца прыхільнікамі звыклага віду гандлю. Погляды палемістаў разыходзіліся і

наконт вагі коннага гандлю ва ўсім тавараабароце кірмашу. Па Шыраеву, галоўны прадмет гандлю – коні  і буйная рагатая жывёла. А Баброўскі прыводзіў неабвержаны статыстычны доказ процілегламу: на долю коней прыходзілася толькі 3%, а мануфактуры – 54%.

Павел Баброўскі ўвогуле ўнёс вельмі вялікі ўклад у апісанне функцыянавання Зэльвенскага кірмашу. У працы "Матэрыялы для геаграфіі і статыстыкі Расіі, сабраныя афіцэрамі Генеральнага штаба. Гродзенская губерня" (1963 г.) ён апісвае і месца правядзення кірмашу, дае звесткі аб умовах перавозкі тавараў, аб кошце гэтых перавозак з розных населеных пункаў(Гродна-Зэльва, Беласток-Зэльва, Варшава-Зэльва і г.д.)

Нямала цікавых звестак пра Зэльвенскі кірмаш змешчана ў 3-ім томе фундаментальнай працы "Жывапісная Расія", падрыхтаваным Адамам Кіркорам. Напрыклад, адтуль мы даведваемся аб пародах коней, якіх гадавалі на конным заводзе Сапегі, і аб іх колькасці. Гэта былі англійскія, дацкія, турэцкія і іншыя скакуны, а іх колькасць дасягала 1500 штук.

Згадаў Міхаіл Шаўчэня і пра даследаванні Мікалая Улашчыка, які прыводзіў вельмі яскравы прыклад пра кірмаш 1830-га года: раней акцёры, пакідаючы Зэльву, прасілі грошай на кавалак хлеба, а ў той год "засталіся задаволены зборам".

З даследчыкаў больш позняга часу навуковец адзначыў І.Казлоўскага, В.Шведа, а таксама нашых землякоў Т.Броска, С.Чыгрына і У.Ягоўдзіка. Ішоў зацікаўлены абмен думкамі паміж вучоным і прысутнымі. Даследчык або прыводзіў неабвержныя факты з прац іншых вучоных, або выказваў асабістае меркаванне.

**Інтрыгуючыя знаходкі Аляксандра Доўнара**

Трэці раз прыязджае ў Зэльву загадчык аддзела спецыяльных гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі А.Б. Доўнар. Ён даследаваў тэму "Зэльва ў другой палове XVIII стагоддзя". Шмат працаваў у розных архівах. Дакументаў у іх шмат, і, каб выявіць неабходныя, не хопіць часу цэламу інстытуту. Таму так радуецца кожны даследчык, калі знойдзе нешта, вартае яго ўвагі. Аляксандр Барысавіч спадзяецца адшукаць яшчэ больш па-

цвярджэнняў аб існаванні ва ўладаннях Сапегаў самакіравання. Некалькі Інструкцый Францішка Сапегі аб увядзенні "магдэбургскай правамоцнасці" ў Зэльве і Дзярэчыне вучоны знайшоў. І вось што распавёў аб гэтым удзельнікам круглага стала.

"Другая палова XVIII – пачатак XIX стагоддзя – гэта перыяд, звязаны з распаўсюджваннем ідэалогіі Асветніцтва, прапагандай свабоды асобы, абароны правоў чалавека. І Францішак Сапега (1772-1829 гады жыцця)

распрацаваў шэраг Інструкцый, што адпавядалі патрабаванням часу. Прытым ён улічваў, што жыхары яго ўладанняў – не толькі хрысціяне, але і яўрэі, таму і Інструкцыі для іх былі асобныя.

Прычын увядзення самакіравання было некалькі. Асноўная – неабходнасць выхаду са складанага грамадска-палітычнага становішча ў сувязі з трыма падзеламі Рэчы Паспалітай. Сапега імкнуўся стварыць умовы “для ўсеагульнага дабрабыту”, для развіцця і аздобы мястэчка, унутранага парадку ў ім, за якім бы і наглядвалі самі насельнікі.

У асноўны орган кіравання – магістрат – павінна ўвайсці 6 чалавек: бурмістр, чатыры радцы і пісар. Пасады ўсіх – выбарныя. Бурмістр выбіраўся на 2 гады, радцы – на адзін год, пісар – на 3 гады. Прычым адна асоба выбіралася на пасаду не больш, як на 2 тэрміны і не магла займаць дзве пасады адначасова. Каб быць рэкамендаваным на любую з іх, чалавек павінен быў мець нерухомую маёмасць, даход не менш 100 злотых у год, узрост больш за 24 гады, быць прыкладам паводзін у штодзённым жыцці. Не маглі вылучацца і быць выбранымі мяшчане з аднаго роду (бацька і сын, цесць і зяць, брат і швагер). Каб выбары сапраўды былі выбарамі, на кожную пасаду вылучалася па 3 кандыдатуры .

Адслужыўшы службу ў храме, мяшчане збіраліся ва ўстаноўленым месцы і ў прысутнасці прадстаўніка двара ўносілі кандыдатуры ў спіскі, а потым выбіралі годных на магістрацкія пасады людзей. Пасяджэнні магістрата праводзіліся два разы на тыдзень: у аўторак і чацвер з 8 да 12 гадзін дня.

За збор гарадскіх даходаў адказваў касір. У спецыяльную кнігу ён уносіў усе паступленні, а грошы захоўваў у спецыяльнай скрыні, якая замыкалася з дапамогай 3 ключоў. Адзін ключ захоўваўся у прадстаўніка панскага двара, другі – у прадстаўніка магістрата, трэці – у касіра. Так што прысвоіць сабе збор не мог ніхто.

Падобным чынам выбіраліся прадстаўнікі ад яўрэяў у іх абшчыну. Кандыдаты таксама павінны былі быць добрымі аселымі гаспадарамі, уносіць у кагал штогод 10 злотых з даходу, ведаць усе яўрэйскія правы і звычаі. Выбары адбываліся ў сінагозе. Прадстаўлялі абшчыну 12 чалавек: чатыры старшыні і восем радцаў. Тэрмін іх кіравання – адзін год.

Пасяджэнні адбываліся ў тыя ж дні, шо і ў хрысціян, толькі ў розныя гадзіны: з 15:00 да 18:00.

На пытанне прысутных, якія ёсць доказы дзейнасці прадпісанняў Сапегі, Аляксандр Барысавіч адказаў: “Так, факты ёсць. Напрыклад, ад 12 ліпеня 1797 года зафіксавана скарга, у якой патрабуецца, каб у кагал не выбіралі больш асобаў, маладзейшых за 24 гады. Значыць, такі факт меў месца.

Знойдзены дакумент 20-ых гадоў XIX стагоддзя, у якім гаворыцца аб наяўнасці ў Зэльве гарадскога пісара (як памятаем, ён выбіраўся разам з бурмістрам і радцамі)”.

Будзем спадзявацца, што да наступнага прыезду ў Зэльву Аляксандр Барысавіч абавязкова знойдзе яшчэ больш доказаў існавання самакіравання ў Зэльве і Дзярэчыне.

**Жыццё мястэчка пасля адмены прыгоннага права**

Таццяна Даўгач пазнаёміла прысутных са змяненнямі ў жыцці местачкоўцаў пасля адмены ў 1861 годзе прыгоннага права. Як і ўсе мястэчкі той пары, Зэльва была пераходным мосцікам паміж укладам жыцця гараджан і вёсак, што садзейнічала захаванню як традыцыйнага ўкладу, так і новага, капіталістычнага. Прадстаўнікамі неземляробчых прафесій былі яўрэі: гандляры, рамеснікі, сталяры, рамізнікі, муляры і г.д. Па колькасці насельніцтва яўрэі пераўзыходзілі хрысціян у два і нават больш разоў.

Хрысціяне – беларусы  і палякі – жылі за кошт працы на зямлі. З іх асяроддзя пачалі вылучацца першыя інтэлігенты: сельскі ўрач Аляксей Лабадоўскі, выпускнік Кіеўскага  ўніверсітэта, настаўнік Трафім Клімук, які скончыў настаўніцкую семінарыю.

Зэльва становіцца цэнтрам воласці ў складзе Ваўкавыскага павета. Яна была самай вялікай па колькасці насельніцтва сярод іншых валасцей (Крамяніцкай, Міжэрыцкай, Пянюгаўскай. Самаравіцкай). Кіраўніком воласі быў старшыня валасны, якога выбіралі сяляне. Па дзеючых правілах адлегласць ад вёскі  да воласці не павінна   перавышаць 12 вёрст, хіба што трапляўся маёнтак, землі якога дзяліць не дазвалялася . Валаснoе праўленне – элемент самакіравання, і гэта, безумоўна было прагрэсіўнай з’явай. Сяляне самі вырашалі шэраг земляробчых пытанняў.

Рэарганізоўваліся сістэмы адукацыі і аховы здароўя. Пачало дзейнічаць народнае вучылішча.Здароўе сялян перастала цалкам залежаць ад добрай ці нядобрай волі  памешчыкаў. У 1886 годзе была адкрыгга станцыя Зэльва, што садзейнічала міграцыі насельніцтва. У адрозненне  ад усходніх раёнаў Беларусі, у заходняй яе  частцы мігранты не асядалі ў Еўропе, Прыбалтыцы ці Расіі, а вярталіся з заробкаў дамоў, каб ці купіць землі, ці пабудаваць дом, ці адкрыць нейкую справу.

У самой Зэльве дзейнічалі крухмальнае і лесапільнае прадпрыемствы, піваварня, свечкавая майстэрня, вадзяны млын, вінакурня.

Заінтрыгавала новымі знаходкамі ў  архівах Р.У Зянюк. Ёй давялося раслумачваць прысутным нават паняцці «рубрыцэлі» і «схематызм», што былі прадметам яе пошукаў. А працавала яна  з даведнікамі па гісторыі касцёлаў;

парафій, календарамі пастаянных і рухомых святаў, каталогамі, звесткамі пра духавенства і г.д. Гэта старонка нашай гісторыі вывучана найменей, таму выклікала шэраг пытанняў да даследчыцы. Раіса Уладзіміраўна добра арыентуецца ў гісторыі Зэльвенскай парафіі, мае звесткі пра тых, хто працаваў у касцёле ў розныя часы яго існавання (напрыклад, у 1828,1832 гт.). Лічыць што шмат інфармацыі можна знайсці не толькі ў архівах, але і ў самых храмах.

**«Адна з найярчэйшых старонак у гісторыі Зэльвы»** усклікнула, падводзячы вышік размовы за круглым сталом, дацэнт БДЭУ Т.У. Вароніч. Можна толькі пазайздросціць яе студэнтам: настолькі заварожвае Таццяна Уладзіміраўна сваім яркім эмацыянальным выступленнем!

Гісторык параўнала паказчыкі пяці самых вядомых кірмашоў Гродзенскай губерніі. І ўсе параўнанні былі на карысць Ганненскага. Так, у Гродна прывозілі тавараў на 1,5 тыс. рублёў, у Свіслачы на 70 тысяч, а ў Зэльву на 670 тысяч! І няхай у XVIII стагод дзі тавараў рэалізоўвалася на 70 %., а ў XIX-ым - на 50%, усё роўна гэта вельмі значны паказчык.

Па месцах, якія займалі тавары розных краін, першае належала расійскім, другое - еўрапейскім, трэцяе - азіяцкім. Вядомы імёны некаторых «доўгажыхароў» кірмашу, якія штогод дастаўлялі свае тавары ў Зэльву. Напрыклад, Дзехцяроў больш трыццаці год працаваў на нашым кірмашы. (Напэўна, сваёй адданасцю яму ён заслужыў і прывілеяванае становшіча, бо хто не ацэніць любові?!) . Купец Зотаў таксама не скупіўся на расходы і штогод вёз з няблізкай расійскай сталіцы тавараў на 40-50 тысяч серабром.

«Пасартавала» Таццяна Уладзіміраўна і шматлікія тавары ў працэнтах. Ювелірных, металічных вырабаў бывала да 7%, шкляных, крыштальных, люстраных 3%, тканін 54 % , галантарэі - 23% і г. д. Прадметаў масцтва і кніг было няшмат, каля 1 % запыт быў і на іх.

...Усё больш і больш цаглінак-даследаванняў нарыхтоўваюць для фундаментальнай працы пра Ганненскі кірмаш беларускія навукоўцы. І няхай аўтарамі манаграфіі абавязкова будуць тыя, хто ўжо ўнёс важкі ўклад у яе стварэнне.

**Дунец, А. Экое «чудо» к нам приплыло / Анастасия Дунец // Праца. – 2021. – 4 сентября. – С. 13.**

Зрелищно, комично и местами непредсказуемо, представили самодельные плавательные средства участники заплыва «На чем попало». В этом году к берегу Зельвенского водохранилища причалили 12 судов, на борту которых

оказались весьма неожиданные герои Верка из ЖЭСа, Малефисента, сам князь Сапега и даже африканские аборигены!.. Но обо всех по порядку.

Это сегодня диковинный заплыв стал традицией зельвенского лета. Однако ещё 6 лет назад костюмированные старты впервые организовали не на местном море, а на Августовском канале. Водное шоу прижилось на Гродненщине, и уже через год (в 2016-ом) спортивный праздник прошёл и в Зельве в рамках Анненского кирмаша. С тех пор что ни год аудитория конкурса растёт. Притом увеличивается не только количество, но и география участников. Так, юбилейный фестиваль собрал команды из Зельвенского, Слонимского и Свислочского районов.

Гостей, конечно, было в меньшинстве. Два плавсредства (но каких!) прибыли к местным берегам из «акватории» Слонимского мясокомбината и Свислочского участка электросвязи. Конкурсанты оказались бывалыми. Например, слонимский квинтет в ярких образах африканцев неоднократно удивлял зрителей районных и областных заплывов. И выступления команды были результативными. В копилке «аборигенов» – многочисленные местные награды и даже Гранпри областного заплыва 2019 года на Августовском канале. Чего уж тут скрывать: и зельвенской публике слонимчане приглянулись. Вожак племени и четыре очаровательные «африканки» в ярких мини-юбках уверенно преодолевали дистанцию на экоплоте из вторичных материалов (поддонов и пластиковых ёмкостей). Динамику заплыву придавали ритмы бубна, чётко выбиваемые «чернокожей» девушкой.

Мужское трио из Свислочи «парило» по водной глади на самой массовой модели истребителя Великой Отечественной войны «ЯК-9». Своё изобретение связисты воссоздали по мотивам кинофильма «В бой идут одни старики» и назвали Кузнечиком. Зелёного крылатого красавца встречали бурными овациями, а мальчишки с берега мечтали вслух: «Полетать бы на таком!». Однако появление Малефисенты заставило насторожиться юных зрителей. Напрасно! Рогатая злая фея в чёрном одеянии, по легенде заколдовавшая маленькую принцессу Аврору, в честь юбилейного фестиваля сменила гнев на милость, порадовав собравшихся «огненным» танцем.

Кстати, в рамках нынешнего заплыва было представлено немало сказочных образов. Например, на плоту Зельвенской ЦРБ «рулил» Змей Горыныч, на плавсредстве ДРСУ-118 – Лесная фея и Леший, а сотрудники РОЧС усадили в жемчужную раковину юную Русалочку, зазывавшую дельфина.

Не успели зельвенцы проводить хвостатую красавицу, как на водной глади «засияла» яркая украинская дива. Верка, правда, не Сердючка, а из ЖЭСа.

– Хорошо! Всё будет хорошо, – пели вслед зажигательной участнице (если быть точнее, ряженому мужчине) с берега.

Ещё одним любимцем публики стал Пропанчик на велосипеде. Красно-жёлтая ростовая кукла, символизирующая органическое вещество, вхоящее в состав природного газа, уверенно «рулила» железным конём. Основой оригинального плавсредства стал вполне ожидаемый для команды района газоснабжения материал – малолитражные газовые баллоны.

Не обошёлся заплыв и без почётного рода Сапег. Князь и его избранница (работники центра социального обслуживания населения) радушно приветствовали пришедших, проплывая мимо. А чтобы юбилейная ярмарка удалась, Сапега провёл символичный обряд: осыпал берег водохранилища золотыми монетами.

Команда гимназии в этом году сделала выбор в пользу «роднага», украсив плавательное средство в национальном стиле. Главными героями на плоту были белорус в льняной рубахе и соломенной шляпе и его «прыгажуня» в колоритном костюме. Этнический стиль не остался без внимания. Жюри отметило педагогический заплыв специальным призом от районной организации «Белая Русь». Ещё одна спецноминация от газеты «Праца» досталась княжескому дуэту (команде ЦСОН).

А вот главный пьедестал конкурса в большинстве своём заняли гости. На третьем месте расположилось африканское племя из Слонима, на втором – мужское трио из Свислочи и его истребитель «Кузнечик», а золото – у местных. Победителем заплыва «На чём попало» признана команда района газоснабжения. Её Пропанчик на велосипеде «укатил» по зельвенским волнам с золотой медалью!

**Гривачевская, Е. С богатым уловом и уха хороша / Елизавета Гривачевская // Праца. – 2021. – 4 сентября. – С. 13.**

Одним из мероприятий Анненского кирмаша стал конкурс блюд «Рыбныя смакі».

Проходило состязание на территории пляжа, недалеко от спасательной станции. Здесь 11 команд – СШ №3, ЦСОН, ЦРБ, РУП ЖКХ, РЭС, Зельвенского и Кремяницкого сельсоветов, ДРСУ-118, госпредприятие «Бородичи», Зельвенский участок почтовой связи и гимназии №1 – соревновались в кулинарном искусстве.

Команды использовали собственные рецепты и интересные способы оригинального оформления блюда из рыбы. И, по условиям конкурса, должны были не только приготовить, но и творчески презентовать особое кулинарное изделие.

– У нас есть легенда, что раньше на кирмаш ловили чудо-рыбу – русалку. Раз она для нас недосягаема, то решили воплотить ее образ в нашем блюде, – поделились на своей площадке участники команды Зельвенской ЦРБ.

Центр социального обслуживания населения пригласил в отель «Палуба» отведать фаршированную щуку. Госпредприятие «Бородичи» предлагало прогуляться по березовой роще, а как путники устанут, – откушать «ухи

от Петровича». Зельвенский РЭС также подошел к конкурсу креативно: у них запеченная в тесте рыбка плавала в импровизированном аквариуме.

А ДРСУ-118 зазывало, используя в качестве слогана видоизмененную аббревиатуру названия организации – «Давайте Ребята Отведаем Ухи!». Кстати, именно на их площадке приостановились отведать рыбных блюд член Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь Виктор Лискович и председатель Зельвенского районного исполнительного комитета Денис Ольшевский.

Все команды украсили свои рабочие места в угоду теме – ведь как никак праздник – Анненский кирмаш. И почти в каждом котелке под закрытой крышкой притаились настоящие шедевры кулинарного искусства.

– Такой конкурс дебютировал примерно 5 лет назад и начинался как соревнование на самую вкусную уху. Сейчас же он претерпел изменения, став более масштабным: участники готовят из рыбы уже разнообразные блюда, – отметил председатель республиканскго общественного объединения «Белорусский рыболовный клуб» Вадим Смоляков. – Очень понравилась уха у Зельвенского сельсовета и Зельвенского участка почтовой связи. Как замечание остальным участникам – истинная уха состоит только из картофеля, морковки, лука, рыбы и специй. Многие пытаются добавлять другие ингредиенты для улучшения вкусовых качеств, что это блюдо только портит.

– Все команды отлично поработали. Приятно было видеть множество коллективов, все отнеслись к конкурсу творчески и креативно. Это говорит о сплоченности и дружбе людей. Ценно то, что они не только работать могут вместе, но и еще так оригинально проводить досуг, – делится председатель районного объединения профсоюзов Ирина Пузач. – Разнообразие также поразило. Та же самая уха, на первый взгляд, такое обычное и привычное блюдо – зато как много вариаций, простора для фантазии! У кого рыба запеченная, у кого жареная, другие приготовили котлеты. Просила рецепт, уточняла, в чем секрет – некоторые его так и не раскрыли.

Оценить кулинарные шедевры смогли не только жюри, но и гости праздника. Многие из пришедших попробовали рыбные изыски разных участников и так-же пытались выведать нюансы их приготовления.

Мероприятие, безусловно удалось, и были определены победители. Так, первое место в конкурсе «Рыбныя смакі» заняла команда ЦРБ, второе – жюри присудило команде РУП ЖКХ, третье – ЦСОН. Специальный приз «За вкусную уху» получил Зельвенский сельсовет, что и было ожидаемо.

**Раскупили 2 тонны шашлыка и тонну хлеба, выручили более 100 тысяч рублей. Анненский кирмаш в цифрах[Электронный ресурс]. – Режим доступа:** https://zelwa.by/annenskij-kirmash-v-cifrah-foto/ **. – Дата доступа: 30.08.2021.**

**1.** На кирмаше присутствовало порядка **5 тысяч** гостей.

**2.** Приняли участие в празднике **123** профессиональных исполнителя.

**3. 338** участников любительского творчества задействовано в различных постановках.

**4.** Проведено **12** конкурсов, победителями которых стали более **60** человек.

**5.** Присутствовало более **80** ремесленников, **10** районных Домов ремесел.

**6.** Было развернуто **96** детских аттракционов.

**7.** Выручка торговли составила более **100** тыс.бел.рублей (без Легендарных эпох).

**8.** Было задействовано **57** субъектов торговли и общественного питания, работало порядка **80** объектов торговли и общественного питания.

**9.** Реализовано более **2** тонн шашлыка.

**10.** Реализована **1** тонна хлебобулочных и кондитерских изделий.